Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Ананіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад-сярэдняя школа”

Урок - прэзентацыя

# “З чаго пачынаецца  Радзіма?”

3 клас

Падрыхтавала:
настаўнік
пачатковых класаў
Смаляк І.М.

2021/2022

**Мэта:** выхаванне вучняў на лепшых традыцыях нацыянальнай культуры.

**Задачы**: раскрыць адметныя якасці беларусаў, нашых продкаў; выхоўваць павагу да беларускага народа, яго гістарычнага мінулага, да роднай мовы, культурнай спадчыны.

**Ход мерапрыемства:**

*(Гучыць беларуская песня.)*

***Вучань:*** Хто мы?
***Вучні*:** Мы – беларусы!
***Вучаніца:*** Мы нарадзіліся на беларускай зямлі, узгадаваліся і жывём у Беларусі.

***Чытач*:**

Радзілася я ў Беларусі,
Дзе ціхі задумлівы бор.
Ляцяць сюды з выраю гусі
Да сініх, цудоўных азёр.

Стаяць векавыя дубровы,
Даносіцца ласкавы шум.
І сонца, і ветрык вясковы
Цяплом саграваюць душу…

Радзілася я ў Беларусі,
Дзе срэбрам крыніцы звіняць,
Сюды з крыкам радасным гусі
З далёкага поўдню ляцяць.

***Настаўнік***. З даўніх часоў на тэрыторыі Беларусі жылі нашы продкі. Чым жа яны займаліся?

***Вучань.*** Галоўным заняткам старажытных жыхароў Беларусі было земляробства. Яны сеялі жыта, ячмень, авёс, проса, грэчку, лён і каноплі.

Продкі беларусаў былі людзі дужыя і працавітыя. Для пасеваў яны высякалі дрымучы лес, а потым яго выпальвалі. Са свойскіх жывёл у нашых продкаў былі каровы, козы, авечкі, свінні, сабакі.

Нашы продкі былі выдатныя паляўнічыя, добра ведалі норавы і звычкі дзікіх звяроў. Яны палявалі на зубра, тура, мядзведзя, лася, вепра. Вельмі развіта было лясное пчалярства. Мёд, воск, звярыныя шкуры старажытныя жыхары Беларусі не толькі спажывалі самі, але і вывозілі ў іншыя краіны.

***Настаўнік.*** Беларусь мая сінявокая! Якая прыгожая назва ў нашай краіны. Беларусь! А яшчэ мы завём яе – Радзіма. А яшчэ – Бацькаўшчына.

Радзіма – бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце. Бацькаўшчына – бо яна нам дасталася ад нашых бацькоў. А ім ад іхніх бацькоў – нашых дзядоў. А далей – ад прадзедаў, ад прапрадзедаў… І так аж да самых далёкіх продкаў.

На нашай беларускай зямлі багата рэк, азёр, а ў жыце ўлетку цвітуць блакітныя васількі. Беларусь – наша Радзіма. А з чаго пачынаецца Радзіма? З песні маці, з роднага слова. Паслухаем вершы пра Беларусь, пра родную мову.

*(Вучні чытаюць вершы.)*

***Чытач 1:***

Я – дзяўчынка-беларуска
з васільковымі вачыма.
Хоць малая, але знаю:
Беларусь – мая Радзіма.
Між лясамі ды азёрамі –
Васільковыя палі…
Я не ведаю, не ведаю
Прыгажэйшае зямлі.

***Чытач 2:***

Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную вучуся
Шанаваць, цаніць, любіць.

***Настаўнік.*** Беларускі народ мае сваю родную беларускую мову. Яна прыгожая, мілагучная, спеўная, лагодная. Мы, беларусы, ганарымся сваёй роднай беларускай мовай.

*( Вучні чытаюць запіс на дошцы: “Хто не шануе сваю родную мову, той не шануе сам сябе”. Ф. Багушэвіч.)*

***Чытач 1:***

Ты адкуль бруішся, мова?
З сініх нёманскіх крыніц?
Па зямлі збіраю словы,
Нібы россыпы суніц.
Мілая, адзіная
Нам, нашчадкам, дадзена
Любаю радзімаю
Ад дзядоў і прадзедаў.

***Чытач 2:***

Француз па-французску, па-польску - паляк
Гавораць з маленства, а я, мама, як?
Замежную мову я ў садзе вучу,
А на беларускай – не ўмею, маўчу.
Чаму, адкажы мне, ты, тата і дзед

Не размаўлялі на роднай нідзе?
Я рускую мову люблю і вучу.
І нашу таксама я ведаць хачу.
Буквар беларускі прашу мне купіць,
І родную мову пачну я вучыць.

***Гульня “Перакладчыкі”.***
**(***Вучні перакладаюць словы з рускай мовы на беларускую.)*
Карандаш - …аловак
Родина - …
Тетрадь - …
Учебник - …
Утро - …
Ёж - …
Дождь - …
Осень - …

***Настаўнік.*** Неацэнны моўны скарб нашага народа – прыказкі і прымаўкі. Ужо няма тых людзей, якія прыдумалі гэтыя трапныя выразы, а прыказкі працягваюць жыць. Прыказкі і прымаўкі даюць карысныя парады, вучаць нас дабру, перасцерагаюць ад дрэнных учынкаў. Ці ведаеце вы беларускія прыказкі і прымаўкі?

*(Вучні называюць прыказкі і прымаўкі).*

Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш.
Хто працуе, той не сумуе.
Спяшыць - людзей насмяшыць.
Усюды добра, а дома лепей.
Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
Хто пытае, той шмат знае.
Малая пчала, ды і тая працуе.
Чалавек невучоны, як тапор нетачоны.

***Настаўнік.*** Заўсёды беларусы вызначаліся здатнасцю да жартаў, кемлівасцю. Скарбонкай народнай мудрасці і назіральнасці лічацца беларускія загадкі. Кемлівасці, дасціпнасці вучыліся дзеткі, калі адгадвалі загадкі. Паглядзім, ці кемлівыя вы, дзеці?

*( Вучні загадваюць загадкі.)*

1.Блакітнае вока ад зямлі высока. *(Неба)*

2.Нахмурыцца , насупіцца,
У слёзы ўдарыцца -
Нічога не застанецца. *(Хмара)*

3.Хвост мой пушысты, кажух мой агністы,
Хітрай называюць і курэй хаваюць. *(Лісіца)*

4.Крылаў не мае, а лятае,
Без рук, а вароты адчыняе,
Без голасу, а спявае.
Без пугі, а хмары ганяе. (*Вецер*).

5.Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. (*Ноч*)

6.Ён раскажа і пакажа, як жыве планета наша.
А няма электратоку - ён без мовы і без зроку. (*Тэлевізар*)

7.З гаспадаром сябруе,  дом вартуе.
Ляжыць пад ганкам - хвост абаранкам. (*Сабака.*)

8.Сосны лечыць ён з вясны,
Доктарам завуць лясным. (*Дзяцел*)

***Настаўнік.***
Я ў вас вось што запытаю,
Вы скажыце, госці, мне:
Ці вам добра тут, ці не?
Ну, тады чаго чакаеце?
Чаму артыстаў не вітаеце?
*(Вучні расказваюць жарты)*

***Сын***. Тата, сёння я адзін ва ўсёй школе мог адказаць настаўніку.
***Бацька.*** А што ён пытаў, сынок?
***Сын.*** Хто разбіў акно.

****

***Маці.***Чаму ты перад сном прычэсваешся?
***Сын***. Трэба. Бывае, сасню, што я ў гасцях, дык сорамна будзе непрычасанаму.

****

***Маці.*** Чаму ты, сынок, нічога ў пару не робіш? Помні, што адклад не ідзе на лад.
***Сын***. Ах, калі так, мамачка, дык тады дай мне сягоння тыя цукеркі, што ты схавала назаўтра.
***Настаўнік***. Ехалі з горкі скарагаворкі.  Па дарозе яны разбіліся на дзве часткі. Іх трэба сабраць.
*(Вучні злучаюць часткі скарагаворак).*

| | |
|---|---|
| У чаплі чапляня, | беламу зайку. |
| Белы бусел баяў байку | таўкуць мак камары. |
| На двары без пары | у зайкі зайчаня. |

*(Вучні вучацца выгаворваць скарагаворкі*)

***Настаўнік***. Завітала ў госці казка – сустракайце, калі ласка!

У даўнія часы, калі простыя людзі яшчэ не ўмелі пісаць, расказвалі адзін аднаму, сваім дзецям розныя цікавыя казкі. Героямі казак былі жывёлы, а таксама выдуманыя істоты. Сюжэты казак былі не толькі забаўляльнымі, але многаму маглі навучыць.

Сёння мы ўспомнім з вамі казкі, складзеныя беларускім народам.

*(Вучні дзеляцца на 2 каманды і складваюць з разразных частак казку.)*

1. Якімі словамі пачынаецца казка "Курачка-раба"? *("Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-раба. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу, ды паставіла на паліцу").*
2. Што крычаў Пеўнік, калі яго схапіла ліса ў казцы "Коцік, пеўнік і ліса"? *("Коце, браце! Мяне ліска нясе у высокія горы, у глыбокія норы, па барах, па карчах, аж бярэ мяне страх!")*
3. Якімі словамі пачынаецца казка "Сынок з кулачок"? *("Жылі дзед і баба. Быў у іх сынок. Ды такі малы, што з-пад шапкі не відаць. Не большы за кулак").*
4. Што казала каза-манюка кожны раз дзеду, калі вярталася з пашы? (*"Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі…"*)
5. Як заканчваецца казка "Куліпка-сынок"? *("А Піліпка прыляцеў з гусямі дахаты. Зарадаваліся бацькі, што Піліпка вярнуўся, пасадзілі яго за стол, пачалі частаваць. А гусям далі аўса. Тут і казка ўся."*)

***Настаўнік***. Малайцы, дзеці! А зараз час пагуляць.

***Беларуская народная гульня "Маша"***

Усе становяцца ў кола, пасярэдзіне знаходзіцца Маша з завязанымі вачамі.

Дзеці прыгаворваюць:
Маша, ты пацеха наша!
Ручкі з золата, ножкі з долата,
Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

*(Маша хапае каго-небудзь з кола і спрабуе адгадаць, хто гэта. Калі яна адгадае імя дзіцяці, той становіцца Машай, калі не - працягвае лавіць дзяцей і адгадваць).*

***Настаўнік.*** Паслухайце яшчэ адну гісторыю.

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Раптам чуюць – спявае нехта. Першы кажа:

– Відаць, жаўранак спявае.

– Не, – кажа другі, – гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

– Ды гэта ж зямля спявае.

Вось якая яна, наша беларуская зямля!

***Чытач 1:***
Радзіма наша – Беларусь,
І колькі не шукай,
Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі
Мілей чым гэты край.
Не знойдзеш ты такіх людзей,
Іх сэрцы – дабрыня;
Яна струменіць, льецца ў свет
Крынікаю штодня.
Таму ў жыцці не трэба быць
Няшчырым, сквапным, злым.
Не забывай, ты – беларус,
І заставайся ім.

***Чытач 2:***
Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі.
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

***Чытач 1:***
Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя.
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.

***Чытач 2:***
Я – беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую і здалля.

***Чытач 1:***
Я – беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
"Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу."

***Чытач 2:***
Высока ў небе вырай кружыць,
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край!

***«Свабодны мікрафон».*** Прадоўжыце, калі ласка, сказы:
а) Мая Радзіма – гэта…
б) Я ўдзячны сваей краіне за тое, што…

в) Мне хацелася б, каб мая Радзіма была самай…
г) Калі вырасту, я …

***Настаўнік.*** Беларусь, Радзіма, Бацькаўшчына… Такія да болю родныя словы. Жыццё раскідвае людзей ў многія куткі Зямлі. Але дзе б вы ні былі, ваш родны край заўсёды будзе для нас тым светлым агеньчыкам, які будзе сваім яркім святлом клікаць нас ў родны край. Гісторыю сваёй краіны і свайго роду павінен ведаць любы паважаючы сябе чалавек, любы грамадзянін Беларусі. Адчувай гонар за людзей, якія славяць тваю краіну. Ганарыся тым, што ты – грамадзянін Беларусі!

Дзякуй усім!